

# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*М.А.БЯСПАЛАЯ*

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЦЭНТРАЛЬНЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ: АГУЛЬНАЕ І АСАБЛІВАЕ

*У артыкуле прадстаўлена пазіцыя аўтара адносна тэарэтычнага аспекта вылучанай праблемы і на падставе параўнальнага аналізу навукова-даследчай дзейнасці цэнтральных музеяў рэспублікі – Нацыянальнага гістарычнага, Нацыянальнага мастацкага і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – разглядаецца своеасаблівая трыяда яе асноўных характарыстык – станаўленне, праблемнае поле і перспектывы, а таксама ўплыў на яе стан і змест сацыякультурнай сітуацыі.*

Навукова-даследчая дзейнасць музеяў стварае шырокае праблемнае поле для вывучэння, разам з тым фундаментальныя навуковыя даследаванні па гэтай праблеме фактычна адсутнічаюць. На сённяшні дзень у музеялогіі актыўна выкарыстоўваецца артыкул Д.І.Цвярской “Навукова-даследчая дзейнасць музеяў”, апублікаваны ў 1977 г., асноўныя яго палажэнні ўключаюцца ва ўсе падручнікі па музеялогіі. Аднак праблема існуе, і на сучасным этапе развіцця музеязнаўства пытанне аб ролі навукова-даследчай дзейнасці музеяў дыскусійнае. Як тэарэтыкі, так і практыкі музейнай справы прызнаюць, што гэты кірунак з’яўляецца фундаментам усіх відаў жыццядзейнасці музея. Дыскусію выклікае пытанне аб суадносінах навукова-даследчай і астатніх кірункаў дзейнасці музея. Прадметам дыскусіі можна лічыць такую пастаноўку пытання: ці могуць музеі захоўваць статус навуковай установы і пры гэтым звяртацца да масавай аўдыторыі? ці можна рацыянальна збалансаваць аспекты навуковы і відовішчны? У такім падыходзе, падаецца, адчуваецца традыцыйнасць поглядаў на музей як, у першую чаргу, навуковую ўстанову, што было характэрна для XIX – пачатку XX ст., калі адбываліся станаўленне тэорыі музейнай справы і выдзяленне ў ёй такога кірунку, як навукова-даследчая дзейнасць, таксама разгортванне дыскусіі аб месцы і ролі музея ў грамадстве.

У 90-х гг. мінулага стагоддзя дыскусія па вызначанай праблеме зноў ажывілася і выявіла існаванне супрацьлеглых поглядаў, асабліва сярод практыкаў, з аднаго боку, і тэарэтыкаў – з другога. Выразныя прыклады прыводзіць Н.М.Здасюк у артыкуле “Навукова-даследчая дзейнасць музеяў Беларусі на сучасным этапе”, абапіраючыся на даныя сацыялагічнага даследавання, вынікі якога паказалі, што практыкі разглядаюць сучаснага навуковага супрацоўніка музея як інтэрпрэтатара, таму што “ў наш час, у адрозненне ад XIX ст., навука больш не робіцца ў музеях. Яна стала больш тэарэтычнай і абстрактнай, а асноўны аб’ект інтарэсу музея – прадмет, які бачны і ўспрымаецца чалавекам. І таму навуковы супрацоўнік музея адрозніваецца ад класічнага вучонага. Ён з’яўляецца пасрэднікам паміж даследчыкам-вучоным і наведвальнікам музея.” А вось некалькі ўзнёслы погляд тэарэтыка: “Толькі вяртанне навукі ў музей дазволіць стварыць нацыянальныя музеі сусветнага ўзроўню”, – які, па-першае, ускосна пацвярджае адыход сучасных музеяў ад навукова-даследчай работы, а па-другое – ёй надаецца найважнейшае значэнне.

Трэба думаць, ісціна знаходзіцца паміж гэтымі двума пунктамі гледжання, таму што падмурак розных відаў дзейнасці музеяў складае навуковы пошук у разнастайных навуковых дысцыплінах, чаго ў XIX ст. не магло быць. Але адводзіць навуцы такую выключную ролю ў дзейнасці музея няма падстаў, бо сучасны музей – перш за ўсё сацыякультурная ўстанова, галоўнай задачай якой, разам з захаваннем, з’яўляецца і трансляцыя гісторыка-культурнай спадчыны ў сацыякультурным асяроддзі.

На думку аўтара артыкула, у пытанні аб узроўнях навукова-даследчай дзейнасці ў музеях ёсць вельмі далікатны момант: ці ёсць падстава лічыць паўнавартаснай навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследчай работай, напрыклад, афармленне навуковых пашпартоў, якое адбываецца пераважна праз камп'ютарныя праграмы. Пагаджаемся, што пры гэтым мае месца навуковы пошук, але ён не заўсёды суправаджаецца спрэс-метадамі навуковага аналізу. Менавіта метадалогія даследавання, якая прыводзіць да новых навуковых вынікаў, дазваляе разглядаць навуковую работу як навукова-даследчую. Але ў артыкуле мы будзем прытрымлівацца прынятага падыходу.

Эвалюцыя музейнай справы дазволіла музеёлагам вызначыць два асноўныя кірункі навукова-даследчай дзейнасці, якія прызнаюцца ўсімі даследчыкамі: музеязнаўчы і ў рэчышчы профільных навук. Першы з іх падзяляецца на такія сегменты, як навуковае камплектаванне фондаў, навуковыя даследаванні ў галіне захавання музейных прадметаў, комплексныя даследаванні пры стварэнні экспазіцый і выстаў і інш. Культурная і асветніцкая дзейнасць музеяў таксама грунтуецца на навуковых распрацоўках многіх навук: педагогікі, псіхалогіі, сацыялогіі.

Другі кірунак навукова-даследчай дзейнасці музеяў звязаны з профільнымі навукамі, у праблемным полі якіх працуе музей, а музейныя калекцыі складаюць іх крыніцазнаўчую базу. Нельга не прызнаць, што гэты напрамак навукова-даследчай дзейнасці для музея вельмі маштабны і складаны, таму што патрабуе высокакваліфікаваных кадраў, якія маюць здольнасць і выразную матывацыю да навукова-даследчай работы. Пра гэта сведчаць цікавыя даследаванні, выкананыя на аснове музейных калекцый, напрыклад, у гістарычнай навуцы. Зразумела, яны не ахопліваюць значных праблемных пытанняў профільнай навукі і прысвечаны ў асноўным некаторым вузкім пытанням, у прыватнасці гісторыі пэўнага перыяду культурнага жыцця краіны.

Да найбольш цікавых у гэтым плане можна аднесці работу Т.А.Карповіч “Культурнае жыццё Мінска першай паловы XIX ст.” (Мінск, 2007), якая рэкамендавана навуковай радай Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, а аўтар (на момант напісання сваёй работы) з'яўлялася вядучым супрацоўнікам музея. Работа Т.А.Карповіч аднесена да катэгорыі навукова-папулярных выданняў, і менавіта гэта надае ёй, дзякуючы ўдала падабраным ілюстрацыям і адпаведнаму стылю выкладання навуковых звестак, інтарэс у больш шырокай чытацкай аўдыторыі. Здаецца, што тут адбілася багатая музейная практыка аўтара, у асяродку якой атаясамліванне патрабаванняў да экспазіцыі і да публікацыі, у першую чаргу, іх даступнасці і зразумеласці для чытача ў той жа ступені, як і для наведвальніка музея. Менавіта гэтая акалічнасць пашырае магчымасці выкарыстання такіх работ у вучэбным працэсе пры разглядзе тэмы, прысвечанай культурнаму жыццю беларускіх гарадоў XIX ст.

Цэнтральныя музеі Беларусі – Нацыянальны гістарычны музей, Нацыянальны мастацкі музей і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – кожны на свой лад, прайшлі этапы стварэння, станаўлення, але падмурак гэтых працэсаў закладзены актыўнай навукова-даследчай, збіральніцкай і пошукавай працай музейных супрацоўнікаў. Як прыклад: шматлікія гісторыка-этнаграфічныя, археалагічныя і іншыя экспедыцыі, якія праводзіліся па ўсёй Беларусі, праца ў архівах дазволілі ажыццявіць камплектаванне фондаў і адкрыць у 1967 г. першую стацыянарную экспазіцыю ў Дзяржаўным музеі Беларусі (сёння – Нацыянальны гістарычны музей).

Высокі навуковы патэнцыял асабліва адметны для Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Не рэдкасць у складзе навуковых аддзелаў супрацоўнікі з навуковымі ступенямі і не толькі кандыдатаў, але і дактароў мастацтвазнаўства, ды і дырэктар музея У.І.Пракапцоў мае вучоную ступень. У розны час у музеі працавалі і працуюць доктар мастацтвазнаўства, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Н.Ф.Высоцкая, кандыдаты мастацтвазнаўства Н.Я.Трыфанава, А.А.Ярашэвіч і інш. Навуковы патэнцыял калектыву выражаецца ў яго актыўнай навукова-даследчай дзейнасці. Як прыклад можна нагадаць навуковыя пошукі, якія суправаджалі стварэнне аддзела старажытнабеларускага мастацтва. Перш за ўсё – гэта шматлікія навуковыя экспедыцыі супрацоўнікаў музея па ўсёй Беларусі з мэтай вывучэння культавых помнікаў жывапісу, скульптуры ў каталіцкіх і праваслаўных храмах краіны. За 1968–1989 гг. было арганізавана каля 70 экспедыцый.

Шмат твораў высокай мастацкай каштоўнасці, асабліва з культавых збудаванняў, знятых з дзяржаўнай рэгістрацыі, перамяшчаліся ў музей, дзе яны тэрмінова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэстаўрыраваліся з прычыны пагрозы іх разбурэння. Вынікам гэтай навукова-пошукавай і даследчай работы стала фарміраванне фактычна новай калекцыі беларускага іканапісу, драўлянай скульптуры, разьбярства і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Апроч чаго, навуковыя супрацоўнікі музея ажыццявілі вялікую і бясцэнную работу па інвентарызацыі культавай маёмасці ў дзеючых храмах, цэрквах на перыяд 70–80-х гг. XX ст. Наяўнасць такой шматлікай калекцыі (каля 2 тыс. прадметаў), навукова апрацаваных і адрэстаўрыраваных, дала магчымасць стварыць у музеі раздзел беларускага мастацтва XII–XVIII стст.

Другім вынікам гэтай работы стала публікацыя каталогаў, некалькіх манаграфій, каля 200 навуковых артыкулаў, абарона дысертацый, удзел супрацоўнікаў музея ў шматлікіх навуковых канферэнцыях рэспубліканскага і міжнароднага значэння. Нацыянальны мастацкі музей выступаў ініцыятарам правядзення навукова-практычных канферэнцый, па выніках якіх выдадзена больш за 10 зборнікаў навуковых дакладаў, каля 20 навуковых каталогаў і альбомаў.

Арганізацыю міжнародных навукова-практычных канферэнцый пачынаючы з 2004 г. практыкуе і філіял музея – замкавы комплекс “Мір”. Усе пяць адбыўшыхся канферэнцый прысвечаны асобным праблемам комплексу – рэстаўрацыі і музеефікацыі, рэалізацыі гістарычнага рэканструявання і інш. Пытанні, якія абмяркоўваліся ўдзельнікамі, былі настолькі вострымі, што вучоны савет музея прыняў рашэнне аб публікацыі матэрыялаў канферэнцый, што і было зроблена ў 2004, 2005 і 2007 гг., астатнія знаходзяцца ў стадыі падрыхтоўкі.

Навукова-даследчая дзейнасць Нацыянальнага гістарычнага музея таксама прайшла пэўныя этапы. Адначасова са стварэннем стацыянарнай экспазіцыі пачынае сваю дзейнасць метадычны аддзел, якім і ажыццяўлялася асноўная навуковая праца. Аднак, думаецца, яе нельга аднесці да ў поўным аб’ёме даследчай, таму што музей адразу фарміраваўся як галоўны метадычны цэнтр для ўсіх краязнаўчых музеяў рэспублікі. Супрацоўнікі аддзела складалі рэцэнзіі тэматыка-экспазіцыйных планаў, удзельнічалі ў стварэнні новых музеяў, праводзілі метадычныя семінары і курсы па павышэнні кваліфікацыі музейных работнікаў. Адным з асноўных відаў дзейнасці з’яўлялася напісанне метадычных лістоў і рэкамендацый, якімі на той час карысталіся ўсе музеі БССР. У асноўным яны былі двух відаў: у адных даваліся рэкамендацыі, у другіх аналізаваўся вопыт лепшых беларускіх музеяў. Толькі ў сярэдзіне 1980-х гг. з’яўляюцца паўнавартасныя метадычныя рэкамендацыі, якія скіраваны на распрацоўку экскурсій, працу з экспазіцыяй, музейнымі калекцыямі і інш. Сярод іх можна выдзеліць метадычныя рэкамендацыі пад назвай “Научное проектирование и художественное оформление музейной экспозиции”, “Научное описание музейных предметов”.

Музей выдаваў значную колькасць каталогаў, брашур, альбомаў, паштовак, даведнікаў, напрыклад цікавы каталог “Плакаты первых лет советского строительства” і інш.

Як ні адзін другі, Нацыянальны гістарычны музей закранулі перамены ў сацыякультурным жыцці рэспублікі напрыканцы мінулага стагоддзя. У сувязі з рэзкай крытыкай яго стацыянарнай экспазіцыі калектыў стаў актыўна ствараць выставы, якія адпавядалі патрабаванням часу, напрыклад “Францыск Скарына і яго час”, “Унікальная калекцыя вырабаў з янтару”, “Мінскі клад”, “Чарнобыль – знак бяды” і інш.

У гэты перыяд у дзейнасці музея назіраецца актывізацыя навуковага пошуку артэфактаў культуры, асабліва навуковае вывучэнне фондавых калекцый, якія б маглі аб’ектыўна сведчыць пра ўсе раздзелы гісторыі Беларусі. Працягвалася праца па каталагізацыі і выданні цікавых каталогаў, напрыклад: “Афішы беларускіх вечарын і спектакляў (1910–1917)”, “Археалагічныя калекцыі. Жалезны век”, “Партрэт Вялікага княства Літоўскага XVI–XVIII стст.”, якія адрозніваліся высокай якасцю мастацкага афармлення.

Сучасны перыяд навуковай дзейнасці музея насычаны шматлікімі падзеямі, сярод якіх заўважнай з’яўляецца выданне часопіса “Музейны веснік” (заснаваны ў 2003 г.). Выданне падсумоўвае вынікі дзейнасці музея за пэўны перыяд, змяшчае матэрыялы навуковых канферэнцый, спіс навуковых публікацый супрацоўнікаў музея, навуковыя канцэпцыі выстаў, музейна-педагагічныя праекты, а таксама хроніку падзей: мерапрыемствы, су-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стрэчы, міжнародныя кантакты, навуковыя форумы. Аналіз зместу часопіса дазваляе дастаткова поўна прадставіць асноўныя кірункі навукова-даследчай дзейнасці музея, якая праходзіць галоўным чынам у рэчышчы гістарычнай навукі, хаця асобныя артыкулы сведчаць пра распрацоўку пытанняў музейнай педагогікі і праблем фондавай работы. Найбольш актыўна даследуецца археалагічная тэматыка, што выклікала патрэбу ў выданні, распачатым у 2006 г., "Археалагічнага зборніка".

Да навуковай дзейнасці музея можна аднесці першую ў краіне лабараторыю прэвентыўнай кансервацыі, на базе якой у 2009 г. прайшла Першая міжнародная школа музейных кансерватараў, у якой бралі ўдзел спецыялісты 15 музеяў Беларусі і атрымалі магчымасць азнаёміцца з набыткамі тэорыі і практыкі ў сферы кансервацыі музейнага тэкстылю і керамікі.

Асабліва важнай і актуальнай навуковай задачай з'яўляецца стварэнне канцэпцыі новай экспазіцыі музея, якая б на сучасным навуковым і мастацкім узроўні адлюстроўвала гісторыю Беларусі. Праект канцэпцыі стаў аб'ектам навуковага абмеркавання на спецыяльна арганізаванай навукова-практычнай канферэнцыі ў 2009 г.

Знакавым для нашай краіны з'яўляецца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. За 66 гадоў дзейнасці супрацоўнікі музея сабралі, навукова апісалі, захавалі каля 140 тыс. музейных экспанатаў, многія з якіх прадстаўляюць асобныя каштоўныя калекцыі, напрыклад рукапісных партызанскіх часопісаў і самаробнай партызанскай зброі.

Адметнай рысай фарміравання калектыву музея з'яўляўся прыём на работу ў першыя пасляваенныя гады былых удзельнікаў вайны – партызан, падпольшчыкаў, франтавікоў. Менавіта яны бралі самы актыўны ўдзел у пошуках ваенных рэліквій падчас камандзіровак у дзеючую армію, а потым шматлікіх раскопах на месцах баёў, напрыклад у Брэсцкай крэпасці. У гэтым калектыве былі абаронены доктарскія і кандыдацкія дысертацыі (праўда, не па ваеннай тэматыцы, асэнсаванне маштабаў якой яшчэ мае быць), А.А.Гужалоўскім абаронена першая і пакуль што адзіная ў рэспубліцы доктарская дысертацыя па гісторыі музейнай справы ў Беларусі.

Навуковыя даследаванні ў музеі вяліся ў межах гісторыі Вялікай Айчыннай вайны праз пошук, аналіз, распаўсюджванне і ўвядзенне ў навуковы абарот новых навуковых фактаў (праз публікацыі артыкулаў у энцыклапедыях, навуковых зборніках, навукова-папулярныя публікацыі ў перыядычным друку, выступленні на навуковых канферэнцыях). Як адно з самых інфарматыўных і прадуманых выданняў можна разглядаць невялічкую брашуру А.Г.Ванькові "Экскурсія ў Трасцянец", у якой распавядаецца аб лагеры смерці Малы Трасцянец, дзе было знішчана 206 500 чалавек і які дзейнічаў недалёка ад Мінска з канца 1941 г. да пачатку аперацыі "Баграціён". Аўтар адшукала і змясціла ў брашуры здымкі некаторых ахвяр, назвала прозвішчы многіх злачынцаў. За гэтай маленькай брашурай стаіць велізарная шматгадовая навукова-пошукавая праца аўтара.

Перамены 1990-х гг. у сацыякультурным жыцці рэспублікі выклікалі інтарэс да малавядомых старонак Вялікай Айчыннай вайны. Навуковыя супрацоўнікі музея друкуюць цікавыя артыкулы самай разнастайнай тэматыкі, напрыклад: "Ваенныя грошы Другой сусветнай вайны ў музейнай калекцыі баністыкі", "Гісторыя Першага і Другога Беларускіх драматычных тэатраў у дакументах музейных фондаў", "Дзіцячыя дамы Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны" і інш. Музей выдаў два выпускі "Сообщений Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны", якія складаюцца з навуковых артыкулаў супрацоўнікаў, напісаных на падставе вывучэння музейных фондаў. Шкада, але наступных выпускаў не адбылося, да таго ж пакуль што музей не можа наладзіць выпуск перыядычнага навукова-метадычнага выдання.

Прызнана, што адной з форм навуковай працы музея лічыцца публікацыя каталогаў і альбомаў. Цікавым і самабытным выданнем музея стаў фотаальбом "Партызанскі альманах (1944–2009)", які складаецца з умоўных раздзелаў: гісторыя стварэння партызанскіх рукапісных часопісаў, зараджэнне партызанскага руху, баявыя аперацыі партызан, іх паўсядзённае жыццё і інш. Музей рыхтуе да выдання каталог самаробнай партызанскай зброі.

А вось пытанне аб навукова-даследчай рабоце ў галіне музеялогіі застаецца запатрабаваным. Відавочна, што значных работ па тэорыі і гісторыі музейнай справы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калектывах усіх трох музеяў не з'явілася. Аднак, на наш погляд, своеасаблівы ўнёсак у гэты кірунак навукова-даследчай дзейнасці належыць навукова-метадычнай рабоце. Яна прадугледжвае сістэматызацыю назапашанага вопыту, аналіз рарытэтаў і відавочных памылак – гэта аналітычная праца патрабуе адпаведнага прафесіяналізму. Першыя метадычныя распрацоўкі выкарыстоўваліся ў саміх музеях, але па меры назапашвання вопыту сталі арыентавацца на профільныя музеі. Справа ў тым, што кожны з разглядаемых музеяў з'яўляецца вядучым у групе роднасных музеяў і таму выконвае функцыю галаўнога метадычнага цэнтра, які аказвае навукова-метадычную дапамогу па розных кірунках музейнай практыкі. Дадзены аспект дзейнасці цэнтральных музеяў можа стаць прадметам асобнага артыкула.

Напрыканцы зазначым, што асноўныя дасягненні навукова-даследчай работы ў музеі (на прыкладзе аналізу дзейнасці трох буйных беларускіх музеяў) звязаны з профільнай навукай. У многім падобны і формы ўвядзення ў навуковы абарот вынікаў даследавання – ад манаграфіі да каталогаў. Своеасаблівай формай публікацыі з'яўляецца стварэнне новых экспазіцый і выстаў – гэты працэс прыкметна актывізаваўся ў апошнія дзесяцігоддзі.

*M.BESPALAYA*

## SCIENTIFIC RESEARCH IN CENTRAL MUSEUMS OF BELARUS: GENERAL AND PARTICULAR

Author's position concerning a theoretical aspect of the chosen topic is presented in the article. By the instrumentality of the research's comparative analysis of the Republic's central museums (National historical, national artistic and the Belarusian state museum of history of the Great patriotic war) a peculiar triad of its main characteristics - the formation, problem area and the perspectives, as well as the influence on its state and a sociocultural situation is examined.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ